УДК 811.161.3’373

**І. М. Мацвеенка (Мазыр, Беларусь)**

## ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ

*У артыкуле разглядаюцца некаторыя аспекты вывучэння індывідуальна-аўтарскай словатворчасці. Вызначана, што ў беларускім мовазнаўстве найбольш пашыраны словаўтваральны і семантычны аспекты даследавання індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў. Аналіз даследаванага матэрыяла паказвае, што нявырашанымі застаюцца праблема аўтарства і пытанне лексікаграфічнага апісання новаўтварэнняў.*

У гісторыі вывучэння аўтарскай словатворчасці можна вылучыць некалькі аспектаў. Літаратуразнаўчы аспект, звязаны з аналізам літаратурных плыняў пачатку ХХ стагоддзя, разглядаецца ў працах Б. Тамашэўскага [1]. Лінгвістычны аспект вырашае пытанні індывідуальнага словаўтварэння з пункту гледжання лінгвістыкі. Асабліва важнае значэнне ў гэты перыяд мела праца Р. Вінакура «Маяковский – новатор языка» [2], якая актывізавала інтарэс лінгвістаў да «граматыкі паэзіі». У ёй даследчык уводзіць у лінгвістычны ўжытак тэрмін «патэнцыяльныя словы», называючы ім лексемы, «якіх фактычна не існуе, але яны маглі б быць, калі б таго пажадала гістарычная выпадковасць» [2, 15]. У 1957 г. Н. Фельдман у артыкуле «Окказиональные слова и лексикография» прапануе тэрмін «аказіянальнае слова» [3, 66], які замацаваўся ў лінгвістыцы.

Вывучэнне індывідуальна-аўтарскай словатворчасці ў 70-я гг. ХХ ст. падрыхтавала базу для фарміравання яшчэ аднаго аспекту – лінгвастылістычнага. У межах гэтага падыходу аналіз і класіфікацыя аўтарскіх неалагізмаў служаць асэнсаванню іх мастацкай каштоўнасці і асаблівасцей функцыянавання ў тэксце. У гэты час пытаннямі аказіянальнай словатворчасці актыўна займаюцца В. Аляксандрава, М. Бакіна, А. Габінская, У. Лапацін, А. Лыкаў, Р. Намітокава, Э. Ханпіра, распрацоўваючы



МГПУ им. И.П.Шамякина

праблему размежавання неалагізмаў, аказіяналізмаў і патэнцыяльных слоў. Э. Ханпіра прапаноўвае тыповую класіфікацыю аказіяналізмаў [4]. А. Лыкаў і У. Лапацін вывучаюць прыметы, якія характарызуюць аказіянальнае слова [5], [6]. А. Земская даследуе тыпалогію новаўтварэнняў у залежнасці ад спосаба ўтварэння [7], [8]. В. Аляксандрава аналізуе функцыянальны і сістэмны аспекты адрознення неалагізмаў і лексічных неалагізмаў [9, 10, 11, 12]. У працах А. Габінскай разглядаюцца прычыны ўтварэння аказіянальных слоў і іх функцыі ў маўленні [13]. Р. Намітокава падрабязна разглядае словаўтваральны аспект аўтарскіх неалагізмаў [14], [15].

У канцы XX – пачатку XXI ст. інтарэс лінгвістаў да словатворчасці яшчэ больш узрастае. Аб’ектам даследавання становіцца сучаснае маўленне. Новаўтварэнні ў гэты час вывучаюцца ў асноўным як частка ідыялекта пісьменніка, напрыклад, Н. Ляскова [16], або паэта, напрыклад, у даследаваннях Т. Коршунавай [17], В. Нікульцавай [18] аналізуюцца новаўтварэнні І. Севераніна, аказіянальным словам С. Кірсанава прысвечана праца А. Аганесяна [19], аказіяналізмы У. Маякоўскага разглядае А. Астаф’еў [20].

А. Земская ў гэты перыд канцэнтруе ўвагу на аказіянальных утварэннях маўлення сучасных газет [21]. А. Бабенка ў працы «Окказиональное в художественном тексте. Структурно-семантический анализ» разглядае важнейшыя аспекты тэорыі аказіянальнасці [22]. І. Улуханаў распрацоўвае класіфікацыю спосабаў словаўтварэння [23].

У беларускім мовазнаўстве аказіянальным словам пэўны час не надавалася належнай увагі, і толькі пачынаючы з 80-х гг. XX ст. іх вывучэнне актывізуецца. Аднак аказіяналізмы разглядаюцца пераважна ў словаўтваральным або семантычным аспектах. Так, структура і асаблівасці ўжывання больш за 800 аўтарскіх наватвораў пераважна з паэтычных тэкстаў 60–70-х гг. XX ст. разглядаюцца ў даследаванні Г. Басавай [24]. І. Казейка робіць спробу комплекснага аналізу новаўтварэнняў у беларускай мове 60–80-х гг. XX ст. [25]. Дзеяслоўныя суфіксальныя лексемы, у тым ліку і некаторыя аказіянальныя, становяцца аб’ектам аналізу М. Васілеўскага [26]. Даследаванне У. Бобрыка прысвечаецца новаўтварэнням у мове Янкі Купалы [27]. У семантычным аспекце разглядаюцца аказіянальныя словы ў творах сучаснай беларускай паэзіі Н. Чарнаброўкінай [28]. М. Шабовіч даследуе аказіянальныя словы у мастацкіх тэкстах 20-х гг. мінулага стагоддзя [29]. Моватворчая дзейнасць майстроў слова першай паловы XX ст. (семантычны і словаўтваральны аспект) аналізуецца ў працы В. Зразікавай [30]. Шмат артыкулаў па гэтай праблеме належыць М. Прыгодзічу [31] і А. Солахаву [32].

Нягледзячы на даволі значны інтарэс лінгвістаў да аўтарскіх наватвораў, перад даследчыкамі стаіць яшчэ шмат нявырашаных пытанняў.

Адна з праблем, з якой сутыкаюцца даследчыкі аказіянальнай словатворчасці, – праблема аўтарства новаўтварэнняў. У паэтычных тэкстах сустракаюцца адныя і тыя ж словы, напрыклад, новаўтварэнне ***іншасвет*** зафіксавана ў трох паэтаў: *Дождж і дарога ў адноўлены Мір, Але не Мір наш прыпынак, не замак... Зрушыць стагоддзі – як трапіць у вір Ці ў глыбіню **іншасвета** таксама* (І. Багдановіч); *Ты не знойдзеш мяне ў **іншасвеце**, дзе пані аўсянка Ладзіць балі на кіпні* (М. Аляшкевіч); *Абрысы пяшчотныя мройна Акрэсляць табе **іншасвет*** (У. Мароз). Немагчыма вызначыць, ствараліся гэтыя індывідуальна-аўтарскія неалагізмы незалежна адзін ад другога або запазычваліся. Мы прытрымліваемся думкі, што ідэнтычныя новаўтварэнні могуць узнікаць у розных паэтаў незалежна, але кожны раз яны ўспрымаюцца менавіта як індывідуальна-кантэкстныя ўтварэнні, наўмысна створаныя паэтамі для патрэб кантэксту.

Праблемным застаецца і пытанне лексікаграфічнага апісання новаўтварэнняў. Аўтарскія неалагізмы не фіксуюцца ў слоўніках нацыянальных моў. Як адзначае Н. Фельдман, нельга ўключыць усе словы, якія з’яўляюцца прадуктам індывідуальнай словатворчасці, у слоўнік з яго абмежаванымі памерамі [3, 67]. Неалагізмы абавязкова павінны ўваходзіць у склад слоўнікаў, паколькі гэтым «фіксуецца слоўнікавы склад мовы ў момант складання слоўніка», а аказіянальныя словы ствараюць няправільнае ўяўленне аб слоўнікавым складзе мовы [3, 72]. На думку Н. Фельдман, дастаткова разглядзець прыёмы словаўтварэння ў асобным артыкуле слоўніка, каб зразумець сэнс аказіянальнага слова. Разам з тым, улічваць аказіянальныя словы трэба, і для гэтага можна скласці спецыяльны слоўнік, напрыклад, слоўнік аказіянальных слоў рускіх пісьменнікаў [3, 73].

Распрацоўкі ў гэтым напрамку вядуцца зараз і ў беларускім мовазнаўстве, напрыклад, спроба стварэння лексікаграфічнай працы была зроблена Г. Басавай і М. Прыгодзічам. На старонках часопіса «Роднае слова» яны надрукавалі 157 аўтарскіх неалагізмаў, прапанаваўшы сваю структуру слоўнікавага артыкулу: слова падаецца ў пачатковай форме, указваецца яго прыналежнасць да пэўнай часціны мовы, вызначаецца лексічнае значэнне або ўказваецца ўтваральная аснова [33].

Як адзначае А. Солахаў, выданне слоўнікаў індывідуальна-аўтарскіх слоў забяспечыла б чытачам належнае разуменне мовы беларускай паэзіі і прозы [34, 270]. Разам з тым, пытанне адбору лексічнага матэрыялу ўяўляе сабой складаную праблему. Для адрознення аказіянальных слоў ад узуальных даследчыкі звычайна карыстаюцца лексікаграфічнымі даведнікамі літаратурнай мовы. У Беларусі яшчэ не створаны агульнабеларускі дыялектны слоўнік і слоўнік мовы фальклору, таму іншы раз дыялектнае або фальклорнае слова можны прыняць за індывідуальна-аўтарскае.

**Літаратура**

1. Томашевский, Б. В. Стилистика и стихосложение / Б.В. Томашевский. – Л.: Изд-во ЛГУ, 1959. – 535 с.
2. Винокур, Г. О. Маяковский – новатор языка / Г.О. Винокур. – М.: Сов. писатель, 1943. – 136 с.
3. Фельдман, Н. И. Окказиональные слова и лексикография / Н. И. Фельдман // Вопр. языкознания. – 1957. – № 4. – С. 64 – 73.
4. Ханпира, Э. Окказиональные элементы в современной речи / Э. Ханпира // Стилистические исследования на материале современного русского языка: сб. ст. / под ред. В. Д. Левина. – М. , 1972. – С. 245 – 317.
5. Лыков, А. Г. Современная русская лексикология (русское окказиональное слово) / А. Г. Лыков. – М. , 1976. – 120 с.
6. Лопатин, В. В. Рождение слова: Неологизмы и окказиональные образования / В. В. Лопатин. – М.: Наука, 1973. – 152 с.
7. Земская, Е. А. Современный русский язык. Словообразование / Е. А. Земская. – М.:Просвещение, 1973. – 304 с.
8. Земская, Е. А. Окказиональные и потенциальные слова в русском словообразовании / Е. А. Земская. – Самарканд, 1972. – С. 19–28.
9. Александрова, О. И. Поэтические неологизмы начала XX века / О. И. Александрова // Рус. речь. – 1974. – №1. – С. 42 – 46.

МГПУ им. И.П.Шамякина

10. Александрова, О. И. О текстовых функциях поэтических новообразований (на материале поэзии начала XX века) / О. И. Александрова // Язык и композиция художественного текста. – М. , 1983.

11. Александрова, О. И. К проблеме классификации новых слов / О. И. Александрова // Сб. науч. тр. / Куйбыш. пед. ин-т. – Куйбышев, 1974. – Вып. 133. – С. 3 – 19.

12. Александрова, О. И. Русское поэтическое словотворчество / О. И. Александрова // Сб. науч. тр. / Куйбыш. пед. ин-т. – Куйбышев, 1978. – Т. 218. – С. 3 – 73.

13. Габинская, О. А. Типология причин словотворчества / О. А. Габинская. – Воронеж: Изд-во Воронежского ун-та, 1981. – 153 с.

14. Намитокова, Р. Ю. Авторские неологизмы: словообразовательный аспект / Р. Ю. Намитокова. – Ростов-на-Дону: Изд-во Ростовского ун-та, 1986. – 160 с.

15. Намитокова, Р. Ю. Авторские новообразования: структура и функционирование (на материале современной поэзии): автореф. дис. д-ра филол. наук: 10. 02. 01 / Р. Ю. Намитокова; Адыгейский гос. пед. ин-т. – Майкоп, 1989. – 33 с.

16. Николина, Н. А. Типы и функции новообразований в прозе Н. С. Лескова / Н. А. Николина // Русский язык в школе. – 1995. – №2. – С. 79 – 87.

17. Коршунова, Т. Н. Семантико-деривационная структура и функционирование новообразований в художественных произведениях Игоря Северянина: дис... канд. филол. наук: 10. 02. 01 / Т. Н. Коршунова, Орловский гос. ун-т. – Орёл, 1999. – 248 с.

18. Никульцева, В. В. Лексические неологизмы Игоря Северянина (деривация, значение, употребление): дис. канд. филол. наук: 10. 02. 01 / В. В. Никульцева, Моск. гос. областн. ун-т. – М. , 2004. – 295 с.

19. Оганесян, А. Г. Окказиональные слова в поэзии С. Кирсанова (словообразовательно-стилистический аспект): автореф. дис. канд. филол. наук: 10. 02. 01 / А. Г. Оганесян, Ин-т русск. языка АН СССР. – М. , 1998. – 22 с.

20. Астафьев, А. Ю. Художественные функции окказионализмов (на материале поэм В. В. Маяковского): автореф. дис. канд. филол. наук: 10. 02. 01 / А. Ю. Астафьев, Моск. гос. областн. ун-т. – М. , 2007. – 17 с.

21. Земская, Е. А. Активные процессы современного словопроизводства / Е. А. Земская // Русский язык конца XX столетия (1985-1995). – М.: Языки русской культуры, 1996. – С. 90–141.

22. Бабенко, Н. Г. Окказиональное в художественном тексте. Структурно-семантический анализ: уч. пособие / Н. Г. Бабенко. – Калининград: Изд-во Калининградского гос. ун-та, 1997. – 81 с.

23. Улуханов, И. С. Единицы словообразовательной системы русского языка и их лексическая реализация / И. С. Улуханов. – М. , 1996. –222 с.

24. Басова, А. И. Окказиональные слова в современной белорусской художественной речи: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10. 02. 02 / А. И. Басова, Бел. гос. ун-т. – Мн. , 1981. – 24 с.

25. Козейко, И. П. Словообразовательные неологизмы в современном белорусском языке (на материале 60-70 гг. XX в.): автореф. дис. … канд. филол. наук: 10. 02. 02 / И. П. Козейко, Ин-т языкознания АН БССР. – Мн. , 1989. – 17 с.

26. Васілеўскі, М. С. Неалагізм у мастацкім творы / М. С. Васілеўскі // Весці Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1988. – № 5. – С. 106 – 111.

27. Бобрик, А. В. Новообразования в языке Я. Купалы: автореф. дис. канд. филол. наук: 10. 02. 02 / А. В. Бобрик, Ин-т языкознания им. Я. Коласа АН РБ. – Мн. , 1992. – 28 с.

28. Чарнаброўкіна, Н. У. Аказіянальныя словы у складзе лексічных сродкаў сучаснай беларускай паэзіі: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10. 02. 02 / Н. У. Чарнаброўкіна, Бел. дзярж. ун-т. – Мн. , 1998. – 14 с.

29. Шабовіч, М. В. Аказіянальнае слова ў мастацкім тэксце / М. В. Шабовіч // Моўныя адзінкі ў кантэксце: Зб. навук. арт. / Мін. дзярж. пед. ін-т. – Мінск, 1991. – С. 102 – 108.

30. Зразікава, А. В. Семантычная і словаўтваральная структура індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў (на матэрыяле беларускіх мастацкіх твораў першай палавіны XX ст.): аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10. 02. 02 / А. В. Зразікава, Бел. дзярж. ун-т. – Мн. , 2006. – 20 с.

31. Прыгодзіч, М. Р. Аўтарскі неалагізм у мастацкім творы / М. Р. Прыгодзіч // Полымя. – 1984. – №6. – С. 204 – 208.

32. Солахаў, А. В. Аказіяналізмы ў прасторы і часе / А. В. Солахаў // Актуальныя праблемы функцыянавання і развіцця лексікі славянскіх моў: матэрыялы Міжнар. навук. канф. , прысвечанай 60-годдзю універсітэта, 7–8 кастрычніка 2004 г. , г. Мазыр / адк. рэд. А. В. Солахаў. – Мазыр: УА МДПУ, 2004. – С. 127 – 130.

33. Прыгодзіч, М. Р. Сэнс у іх хаваецца яшчэ больш, чым паэзія...: Аўтарскія неалагізмы як факт мовы / М. Р. Прыгодзіч // Род. слова. – 1995. – № 8. – С. 56 – 64; № 10. – С. 68 – 73; № 12. – С. 62 – 65.

34. Солахаў, А. В. Выданне слоўнікаў індывідуальна-аўтарскіх (аказіянальных) слоў як надзённая задача беларускай лексікаграфіі / А. В. Солахаў // Сучасныя праблемы беларускай лексікалогіі і лексіканрафіі: матэрыялы Міжнар. навук. канф. , Мінск, 19– 20 ліст. 2005 г. / Інст-т мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – С. 266 – 271.

МГПУ им. И.П.Шамякина